Жалтабрухава, Б. Крыж і церні жыцця / Б. Жалтабрухава // Голас Сенненшчыны. – 2023. – 5 снеж. – С. 5.

**Крыж і церні жыцця**

***Да 145-годдзя з дня нараджэння Андрэя Зязюлі***

Імя Андрэя Зязюлі як беларускага паэта мала вядома грамадскасці нашай краіны. А між тым вядомы ён не толькі сваім паэтычным голасам. Такім псеўданімам падпісваў свае вершы беларускі ксёндз Аляксандр Астрамовіч.



**А. С. Астрамовіч (Андрэй Зязюля)**

Большасць жыхароў Сенненшчыны імя паэта Андрэя Зязюлі для сябе адкрыла параўнальна нядаўна. Яго творчая спадчына малавядома шырокаму чытачу. Бо кнігі, што выдаваліся пры жыцці паэта, у наш час не перавыдаваліся; падшыўкі часопісаў, у якіх змяшчаліся некаторыя вершы, аказаліся ў запасніках Літвы, Польшчы, Расіі; шмат якія матэрыялы, рукапісы аселі ў прыватных архівах.

Для сенненцаў імя гэтага чалавека дорага яшчэ і таму, што Аляксандр Сцяпанавіч Астрамовіч апошнія гады свайго жыцця правёў у нашым горадзе, працуючы ксяндзом у сенненскім касцёле Святой Троіцы.

Нарадзіўся будучы святар і паэт 26 лістапада па стараму стылю (7 студзеня – па новаму) 1878 года ў сялянскай сям'і Сцяпана і Ганны Астрамовічаў, у вёсцы Навасады Гальшанскай гміны Ашмянскага павета (цяпер Астравецкі раён). Пачатковую адукацыю атрымаў у Гальшанах. У 1892 годзе закончыў Ашмянскае павятовае вучылішча. Пасля працаваў на гаспадарцы бацькоў. Самастойна вывучаў французскую мову. З 1 студзеня 1901 да 14 верасня 1903 года служыў у 160-м пяхотным Абхазкім палку ў Гомелі і ў Барысаве. Закончыў службу ў званні малодшага афіцэра. Мара стаць святаром прывяла маладога Астрамовіча ў Вільню. Але паступіць у духоўную семінарыю перашкодзілі ўлады, якія не прынялі яго беларускасці. Не пакідаючы надзеі, ён едзе ў студзені 1906 года ў Пецярбург, дзе здае экзамены на званне аптэкара, чым засведчыў веданне асноў лацінскай мовы, неабходнае для паступлення ў Пецярбургскую духоўную каталіцкую семінарыю, якую паспяхова скончыў у 1910 годзе і быў пасвечаны ў святары. Душапастырскую дзейнасць Астрамовіч пачаў вікарыем ракаўскага касцёла і першую сваю імшу адправіў 2 лютага 1911 года ў вёсцы Трабы Валожынскага павета. Часта мяняў месца службы, бо праследаваўся касцельнымі ўладамі за прыхільнасць да роднага слова, два гады быў без парафіі, у 1920 г. некалькі тыдняў правёў у астрозе Віцебскага губчэка.

З 2 ліпеня 1912 і да лютага 1915 года служыў у парафіі Анопаль Мінскага дэканата. Пазней быў прызначаны вікарыем у Бабруйскую парафію. Са снежня 1916 года служыў у мястэчку Смілавічы Ігуменскага павета. З 9 верасня 1917 года ксёндз Астрамовіч служыць на Віцебшчыне: пробашч касцёла ў Абольцах Аршанскага дэканата. З 1919–1921 гг. Аляксандр Сцяпанавіч – апошні ксёндз касцёла Святой Троіцы ў мястэчку Сянно, дзе і памёр 17 студзеня 1921 года. Лічыцца, што пахаваны ён на мясцовых каталіцкіх могілках, але магіла не была знойдзена. Магчыма, што Астрамовіч як ксёндз пахаваны ў дзядзінцы касцёла, які, на жаль, быў разбураны ў 1961 годзе. У год святкавання 125-годдзя з дня нараджэння беларускага паэта Андрэя Зязюлі – 29 лістапада 2003 года – на Сенненскіх могілках адбылося асвячэнне сімвалічнай магілы паэта.

Андрэй Зязюля быў вядомым культурным і грамадскім дзеячам пачатку XX ст. Літаратурная і асветніцкая дзейнасць яго была звязана з вытокамі беларускага хрысціянскага руху першай трэці XX ст. Большасць ранніх вершаў 1909 – 1912 гг. паэт друкаваў у «Нашай Ніве». Якраз тады Андрэй Зязюля пазнаёміўся і пасябраваў з Янкам Купалам, які вучыўся на агульнаадукацыйных курсах А. Чарняева ў Пецярбургу (1909–1913), а летнія канікулы праводзіў на сваім любімым хутары Акопы.

5 чэрвеня 1912 года ў лісце да свайго духоўнага бацькі Б. Эпімах-Шыпілы Купала пісаў: *«Як перапішу (апрацую) начыста «Паўлінку», – думаю напісаць паэмку «Рагнеда», гістарычную рэч з жыцця Полацкага княства, а пасля, як Бог дасць. На днях маюся з'ездзіць да кс. Астрамовіча, адтуль, пагасціўшы трохі дома, пастараюся быць у Вільні…»*

Пасля заснавання першай беларускай каталіцкай газеты «Беларус» у 1913 г. вершы Зязюлі сталі візітнай карткай гэтага адраджэнска-асветніцкага выдання. У выдавецтве «Беларуса» быў апублікаваны адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў А. Зязюлі на лацінцы «З роднага загону». Родны загон – любая сэрцу паэта Беларусь. Факсімільнае выданне гэтага зборніка захоўваецца ў фондах Сенненскага гісторыка-краязнаўчага музея. Сабраны і іншыя творы пісьменніка, у тым ліку першы беларускі хрысціянскі гімн «Песня Беларусі». Вершы Зязюлі – хрысціянскія, якія прасякнуты гарачай любоўю да Бацькаўшчыны. У сваёй творчасці А. Зязюля паэтызаваў хрысціянскія ідэі, абуджаў сваімі вершамі веру, надзею, любоў, праўдзівасць. У прыродзе, у людзях, у розных праявах жыцця ён бачыў тую красу, вяршыняй якой з'яўляецца Бог. Але ў першую чаргу А. Зязюля – паэт народны, сялянскі, які паэтызуе цяжкую сялянскую працу (вершы «Жніво», «У кузні»), жыццё простага працаўніка на зямлі (вершы «Пасвята», «Мой засценак»), звяртаецца да вельмі рэдкай па тым часе тэмы жаночага лёсу (паэма «Аленчына вяселле»), Страсна, як на крыжы, прысягае ён ніколі не здрадзіць роднаму краю ў сваім выдатным публіцыстычным вершы «Ніколі». Глыбокай пашанай да Радзімы, верай у яе лепшае будучае прасякнуты вершы «Беларусь» і «Веру». Асобна трэба адзначыць велізарную любоў А. Зязюлі да роднай прыроды, тонкае адчуванне і разуменне яе. Паводле сваіх стылёвых прыкмет пейзажная лірыка А. Зязюлі блізкая да коласаўскай. Вершы «У студні», «У лютым», «У красавіку», «Вечар маёвы», «Лес у маі», «Песня салаўя» прасякнуты лірызмам, усхваляванасцю нераўнадушнага назіральніка. З любоўю адносіўся паэт да народнай творчасці. Сабраныя ім па вёсках народныя песні ўвайшлі ў зборнік А. Грыневіча «Беларускія песні з нотамі».

Доўгі час творчая спадчына А. Зязюлі знаходзілася ў забыцці. А між тым багацце і разнастайнасць зместу яго лірыкі, блізкасць паэзіі з творчасцю Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, К. Буйло, безумоўна, звяртае на сябе ўвагу і патрабуе больш глыбокага і аб'ектыўнага яе асмыслення.

Усе творы А. Астрамовіча паводле зместу і стылю – хрысціянскія і асветніцкія: гэта гутаркі добрага настаўніка з духоўнымі дзецьмі – маленькімі, маладымі і сталымі. Доктар філалагічных навук, прафесар А. А. Лойка прысвяціў яго творчасці раздзел у курсе лекцый «Гісторыя беларускай літаратуры». Успамінаючы асобу паэта, беларускі гісторык і публіцыст А. Станкевіч пісаў: «Характарам Астрамовіч быў шчыры, дзіўна просты, запальны і гарачы, заўсёды вясёлы, добры, услужны, горача пабожны і дзіўна патрыятычны». Адраджэнне ў людзях веры, надзеі, любові да Беларусі, яе культуры, абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці, праўдзівасці, імкненне, да хрысціянскіх ідэалаў – галоўныя мэты жыцця і творчасці паэта-святара Андрэя Зязюлі.

**Браніслава Жалтабрухава**,
галоўны захавальнік фондаў
Сенненскага гісторыка-краязнаўчага музея.